ЛИТЕРАТУРА:
1. Айвазова С.К. К истории феминизма // Общественные науки и современность. 1992. № 6. С. 153-168.
2. Конопницкая М. Сочинения в 4 т., пер. с пол., М., 1954. Т. 4.
3. Пиотровская А.Г. Творческий путь М. Конопницкой. М., 1962.
4. Трагер Д. Великие женщины. Хроника. События. Факты. М., 1999.

Шэмяцюк Л.М. (Брэст)

## М.КАНАПНІЦКАЯ І М.БАГДАНОВІЧ: АСЭНСАВАННЕ ГРАМАДСКАГА ЖЫЦЦЯ НА МЯЖЫ СТАГОДДЗЯЎ

Пачатак XX стагоддзя вызначаўся складаным палітычным, эканамічным, сацыяльным становішчам. І для М.Багдановіча, якога ўмовы жыцця вымусілі жыць далёка ад Радзімы, і для М.Канапніцкай, якая з канца XIX стагоддзя працавала за мяжой, новае стагоддзе не прынесла зменаў у лепшы бок. Творчасць абодвух мастакоў не адарваная ад рэчаіснасці, адгукалася рэхам на падзеі, якія адбываліся ў грамадскім жыцці. Аднолькавыя страты перажылі ў дзяцінстве М.Канапніцкая і М.Багдановіч - смерць маці.

М.Канапніцкая нарадзілася ў 1842 г. у Сувалках. Маці памерла рана, але М.Канапніцкая памятае яе. Трыццацічатырохгадовы ўдавец, Ёзэф Васілоўскі, чалавек з вялікім сэрцам і гуманістычнай культурай, пасля смерці жонкі цалкам прысвяціў сябе працы і выхаванню дзяцей. Па натуры быў самотным чалавекам, містыкам, пры гэтым надзвычай рэлігійным. Дзецям пасля смерці жонкі чытаў кніжкі пра Ісуса Хрыста, многае ведаў на памяць. Прывіваў любоў да людзей, да літаратуры. М.Канапніцкая лічыць, што менавіта бацька першы пазнаёміў яе са здабыткамі айчыннай паэзіі, якую яна пазнала з вячэрніх размоў і чытання. Бацька змог перадаваць настрой вершаў так, што калі плакаў ён сам, то і дзеці плакалі разам з ім. [3]

М.Канапніцкая лічыцца паэткай польскага сялянства. Яна ўвасабляе дэмакратычныя традыцыі польскай літаратуры, пачынаючы ад Міцкевіча да Баляслава Пруса і Элізы Ажэшкі. Марыя Канапніцкая выступіла на пачатку літаратурнай дзейнасці з творамі, прасякнутымі дэмакратызмам, любоўю да працоўнага народа, які пакутуе. Калі Г.Сянкевіч апяваў польскую даўніну, то творчасць Канапніцкай была прасякнута пачуццём спачування да вясковай і гарадской беднаты. Аб гэтым сведчыць эпічная паэма “Пан Бальцар у Бразіліі”. Народалюбівыя тэндэнцыі М.Канапніцкай

звязваюць яе з цікавасцю да дэмакратычнай рускай літаратуры (знаходзім водгукі паэзіі Някрасава).

Дачка правінцыяльнага адваката, М.Канапніцкая навучалася ў Варшаўскім пансіёне. Там яна пазнаёмілася з Э.Ажэшкай, сяброўства з якой давала ёй творчыя сілы. Муж Марыі, Яраслаў Канапніцкі, прымаў удзел у польскім паўстанні 1863 г., пасля чаго ўся сям'я вымушана была бегчы за мяжу, у Германію. Але ў 1865 г., пасля ўказа аб амністыі для паўстанцаў, вярнуліся.

Першыя літаратурныя творы друкуе ў Калішы, затым у Варшаве. Яна была рэдактарам жаночага часопіса "Swit" ("Світанне"), у якім выступала за жаночае раўнапраўе.

Эпоха пазітывізму дыктавала свае ўмовы. Прадстаўнікі "варшаўскага пазітывізму", з якімі зблізілася М.Канапніцкая, прапаведавалі "арганічную працу", гэта значыць працу замест рамантыкі, прагрэс – замест адданасці даўніне, веды – замест патрыярхальнай неадукаванасці.

М.Канапніцкая пісала навэлы ўсё сваё жыццё. Пачалася дзейнасць яе як пісьменніцы з дзеннікавых запісаў, у час працы рэдактарам часопіса "Swit". У паперах, пакінутых ёю пасля смерці, засталося многа нявыкарыстаных нататак і эскізаў да апавяданняў.

Не магла быць раўнадушнай паэтка да пакрыўджаных: яна дапамагала адстойваць правы жанчын, удзельнічала ў пратэстах супраць антысемітызму, арганізоўвала акцыі пацярпелых ад прускіх рэпрэсій. Канапніцкая знаходзілася ў цэнтры палітычных падзей свайго часу.

З дзяцінства М.Канапніцкая назірала за тым, як людзі ў неўраджайныя гады стаялі ў чарзе па хлеб з трох гадзінаў раніцы, паміралі ад голаду. І ў гэты ж час на балах заможныя пані мелі ўбранне з Парыжа, Берліна і інш.

У лютым 1890 г. М.Канапніцкая канчаткова пакінула Варшаву, але і ў Цюрыху пабачыла, што людзі таксама пакутуюць ад жорсткасці. Яна лічыла, "што ў вольнай краіне будзе дыхаць лягчэй".

У апавяданні "Міласэрнасць абшчыны" расказваецца пра швейцарскі горад Хатынген. У горадзе існуе суполка, якая абавязана ўтрымліваць беднякоў, якія ўжо не могуць працаваць. Добрая справа. Толькі ёсць адно але... Беднякоў прадаюць з аўкцыёна, пры гэтым грошы плаціць не той, хто бярэ да сябе бедняка, а дзяржава дае пэўную суму па дамоўленасці. І яшчэ: няшчасны бядняк павінен працаваць. Падчас вельмі цяжка. Праводзіць гэтае мерапрыемства саветнік, ён выступае з прамовай, слухаючы якую, здаецца, што сапраўды тут людзі жывуць па законах хрысціянскай міласэрнасці. Бядняк Кунц Вундэрлі – стары, хворы чалавек – чакае, хто будзе яго новым гаспадаром. Ён чуў, што Пробст купляе

беднякоў і прымушае іх так цяжка працаваць, што яны хутка паміраюць. Кунц баіцца. Нават сын Кунца, які мае сваю сям'ю, не можа ўзяць яшчэ аднаго чалавека – роднага бацьку, – таму што прыйдзецца і яго карміць. А тая сума, прапанаваная за бацьку, яго не задавальняе. Вось і прымушаны будзе Кунц працаваць на другіх, маючы сына. [2]

Гэта толькі адно з апавяданняў, у якім М.Канапніцкая пратэстуе супраць несправядлівасці ў класавым грамадстве. Адразу можна прыгадаць творы рускіх класікаў пра несправядлівасць: "Воскресение" Л.Талстога, "Злоумышленник" А.Чэхава. М.Канапніцкая бачыла гэтую жорсткасць і любіла "прыніжаных і пакрыўджаных". Але была ў яе і наіўная вера ў сілу "добрых людзей" і "добрых учынкаў" (верш "Перад судом"). "Добрыя" суддзі бяссільныя перад сацыяльнай несправядлівасцю, калі на злачынства беднату падштурхоўвала не толькі адсутнасць адукацыі!

М.Канапніцкую нельга абвінаваціць у сентыменталізме. Чыстая любоў да людзей была адметнай рысай характару, светапогляду і творчасці М.Канапніцкай. Яна была вольнай ад нацыянальнай абмежаванасці. Пісьменніца разумела сваё прызначэнне і ролю грамадзянскага паэта. У яе творах многа горычы і смутку. Яна пытаецца: чаму на зямлі столькі зла і пакут? Дзе ёсць паратунак ад несправядлівасці? Актыўна адстойвала правы грамадзянскай публіцыстычнай паэзіі: «Нет, не пройдет бесследно наше время,//Мы след в веках оставим величавый,//Пускай родит сегодняшнее семя//Не цветники – дубравы.//Не спрашивай меня, поэт печальный,//Что создано для будущего нами,//Верь тем, кто вместо урны погребальной//Несет в походе знамя.» [2, 8]

Лёс Максіма Багдановіча ў нечым нагадвае лёс М.Канапніцкай. Маці яго памерла ад сухотаў, бацька адзін гадаваў сыноў. Асіроцелая сям'я жыла ў Расіі, далёка ад бацькаўшчыны. Кола інтарэсаў М.Багдановіча было вельмі шырокае. Ён як бы імкнуўся ахапіць думкай Сусвет, ацаніць усё зробленае чалавекам. Веданне нямецкай, французскай, лацінскай, грэцкай моваў (самастойна вывучаў італьянскую, польскую) дазволіла чытаць творы многіх пісьменнікаў у арыгінале. Вядома, што ў арыгінале ён чытаў Міцкевіча, Крашэўскага, Славацкага, Сыракомлю, Канапніцкую.

У М.Багдановіча многа вершаў, прысвечаных роднаму краю, яго жыхарам. Матывы яго твораў – не кніжныя, яны ўзяты з жыцця. Герой М.Багдановіча ўспрымае свет усебакова. Пры тым, што паэт мала ведаў Бацькаўшчыну, ён малюе яе падчас як краіну-мару. Першая сусветная вайна змяніла многае ў жыцці і ў поглядах паэта. Ён піша артыкулы, прысвечаныя славянскім народам: «Братья-чехи» (1914), «Червонная

Русь», «Угорская Русь» (1914), «Образы Галиции в художественной литературе» (1914), «Белорусы» (1915).

Не сустракаем ужо ў творах любоўныя матывы. Вайна прымусіла паэта па-іншаму паглядзець на жыццё, у якім толькі бесчалавечная, жорсткая вайна. Вайна абвастрыла цікавасць Багдановіча да народнага жыцця, узмацніла нацыянальна-патрыятычныя пачуцці. Паэт імкнецца раскрыць індывідуальнае “я”, псіхалогію асобы, якая вымушана змагацца адна з сусветнай жорсткасцю.

Паэт аддана служыў Бацькаўшчыне. Публіцыстычнага характару верш “Пагоня” – прысуд здраднікам. Ідэя яго – дастукацца да сэрцаў людзей, абудзіць іх да жыцця ў роднай краіне: «Маці родная, Маці-Краіна!//Не усцішыцца гэтакі боль...» [1, 273]

Сацыяльна-культурная пазіцыя М.Багдановіча была цесна звязана з нацыянальным беларускім Адраджэннем. І М.Багдановіч, як і М.Канапніцкая, бачыў прызначэнне паэта, творцы ў абуджэнні грамадзянскіх, грамадскіх пачуццяў.

## ЛІТАРАТУРА:

1. Багдановіч М. Збор твораў у 2 т. Мн., 1968.
2. Конопницкая М. Сочинения в 4 т., пер. с польского. М., 1954.
3. Wiesława Grochola, Niełatwo byc̀ Konopnicką, Warszawa 1988.